УДК 378.09 (476.4)

*А.Р. АГЕЕЎ, У.М.АФАНАСЬЕЎ, В.Л. МАРАЗЕВІЧ,*
*С.А.ПАРАШКОЎ, Д.М.ПАПЯЛЫШКА*

# СТАРОНКІ ГІСТОРЫІ МАГІЛЁЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

Магілёўскі дзяржаўны універсітэт сёлета адзначае гадавіну ўтварэння, але адначасова ён святкуе 85-ю гадавіну свайго існавання. І ў гэтым парадоксе няма супярэчнасці. У 1997 г. Магілёўскі педагагічны інстытут набыў статус універсітэта, а радавод свой вядзе ад заснаванага яшчэ ў 1913 г. настаўніцкага інстытута. Таму МДУ сёння па праву лічыцца адной з старэйшых вышэйшых навучальных устаноў нашай краіны.

У пачатку XXст. урад Расійскай імперыі прыняў рашэнне аб пашырэнні сеткі настаўніцкіх інстытутаў. Разумеючы вялікую культурную, асветніцкую, навуковую карысць гэтых устаноў дзеля развіцця рэгіёна ўлады г.Магілёва ў спаборніцтве з іншымі гарадамі Беларусі дамагліся адкрыцця ў горадзе ў 1913г. настаўніцкага інстытута. Магілёўская гарадская дума бясплатна адвяла ўчастак зямлі пад будаўніцтва. Яна і губернскае земства на ўтрыманне ўстановы штогод выдзялялі па 1000 руб. Распачаў сваю дзейнасць інстытут у двухпавярховым будынку на Быхаўскай вуліцы, які арандаваўся ў стацкага саветніка Р.М.Гартынскага.

Ужо ў верасні 1913 г.адбыліся першыя ўступныя экзамены. За 15 дзён абітурыенты напісалі 3 пісьмовыя работы і здалі вусныя іспыты па 9-ці прадметах. Па выніках экзаменаў у першы клас было залічана 35 студэнтаў. Інстытут рыхтаваў настаўнікаў для вышэйшых пачатковых вучылішч і лічыўся сярэдняй навучальнай установай з трохгадовым тэрмінам навучання. Пры ім было створана двухкласнае гарадское вучылішча, у якім студэнты праходзілі педагагічную практыку.

Першым дырэктарам Магілёўскага настаўніцкага інстытута быў прызначаны стацкі саветнік, кандыдат багаслоўя В.Н.Тычынін. У інстытуце працавалі: 1 – законанастаўнік, 4 – выкладчыкі навук, 1 – малявання, 1 – спеваў, 2 – гімнастыкі, 2 – іншых. Іх прозвішчы варта назваць па праву першых: В.П.Сакалоў, М.Г.Руднёў, Е.С.Аляхновіч, С.С.Палуянаў, М.М.Родзін, Ф.І.Стангль, Н.А.Гамолка і настаўнікі гарадскога пры інстытуце вучылішча Е.Ф.Жыхараў, М.М.Пігулеўскі. 3 дзевяці выкладчыкаў шэсць мелі вышэйшую адукацыю. Гадавы заробак у выкладчыка навук складаў 1440 руб., сярэдні па Магілёўскай губерні ў 1913г. – 198 руб.

Першыя студэнты інстытута па сваім веравызнанні былі праваслаўнымі. Усе выхаванцы мелі стаж не менш двух гадоў настаўніцкай работы. Па сваім сацыяльным паходжанні толькі 1 з 35-ці студэнтаў быў з радавых дваран, 3 – з мяшчан і купцоў, 2 – з казакоў, а астатнія з сялян. 30 чалавек атрымоўвалі стыпендыі памерам 150 руб. у год. Плата за навучанне была 25 руб. у год.

У гады Першай сусветнай вайны і рэвалюцыі 1917 г. інстытут меў цяжкасці з наборам студэнтаў, памяшканнем. Частка студэнтаў і выкладчыкаў была мабілізавана на фронт. Тым не менш, першы выпуск адбыўся ў 1916 г., а ўсяго настаўніцкі інстытут падрыхтаваў больш за 100 кваліфікаваных настаўнікаў.

У маі 1918 г. Усерасійскі з'езд работнікаў настаўніцкіх інстытутаў прыняў пастанову аб пераўтварэнні настаўніцкіх інстытутаў у педагагічныя. Магілёў у той час знаходзіўся пад нямецкай акупацыяй. Аднак нягледзячы на вельмі цяжкія

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

ўмовы, інстытут працягваў дзейнічаць і нават правеў чарговы набор студэнтаў.

Пасля вызвалення ад акупацыі адразу пачалася работа па пераўтварэнні настаўніцкага інстытута ў педагагічны – вышэйшая навучальная ўстанова з чатырохгадовым тэрмінам навучання. Да 16 снежня 1918 г. гэтая работа была ў асноўным завершана і быў абвешчаны набор студэнтаў. Магілёўскі педінстытут меў 3 аддзяленні і рыхтаваў настаўнікаў школ першай і другой ступеняў, а таксама работнікаў дашкольных устаноў. Падрыхтоўка настаўнікаў школ другой ступені праходзіла па чатырох цыклах – фізіка-матэматычнаму, сацыяльна-гістарычнаму, біялагічнаму і літаратурна-мастацкаму. Мяняліся формы і метады вучэбнай работы. Замест урокаў пачалі праводзіцца лекцыі і семінарскія заняткі.

Урачыстае адкрыццё МПІ адбылося ў лютым 1919 г. Восенню 1919 г. педінстытут быў пераўтвораны ў інстытут народнай адукацыі. Пры ім ствараецца чацвёртае аддзяленне – працоўных працэсаў па сельскагаспадарчаму цыклу. У пачатку 1921 г. у інстытуце навучалася 360 студэнтаў. З іх каля 60% складалі сяляне, 22,5% – служачыя, 13% – іншыя, 6% – рабочыя. У канцы гэтага ж года адбылася яшчэ адна рэарганізацыя. Інстытут пачаў называцца практычным інстытутам народнай адукацыі (ПІНА). У ім засталося толькі школьнае аддзяленне. Першы курс быў агульнаадукацыйны, другі – агульнапедагагічны, трэці і чацвёрты – спецыяльныя з падраздзяленнем на цыклы: сацыяльна-гістарычны, фізіка-матэматычны і біёлага-геаграфічны. Вучэбную і выхаваўчую работу вялі каля 40 выкладчыкаў,трое з якіх мелі вучоную ступень. Сярод іх можна назваць прафесара Петраградскага медыцынскага інстытута М.В.Сакалова і выкладчыка гісторыі Д.І.Даўгялла.

У гады грамадзянскай вайны і пасляваеннай разрухі жыццё інстытута праходзіла ў вельмі цяжкіх умовах. Не хапала самага неабходнага – паперы, падручнікаў, дапаможнікаў. Выкладчыкі месяцамі не атрымлівалі заработнай платы. Студэнты ў большасці не атрымлівалі стыпендый, вымушаны былі працаваць дзе толькі магчыма, таму заняткі праводзіліся ў вячэрні час.

У 1923 г. урад СССР вымушан быў пайсці на закрыццё і рэарганізацыю некаторых ВНУ. Па рашэнню Наркамасветы Магілёўскі педінстытут перадаў сваю матэрыяльную базу зноў створанаму педагагічнаму тэхнікуму, куды пераводзіліся студэнты падрыхтоўчага аддзялення і першага курса, частка выкладчыкаў і абслуговы персанал. Астатнія студэнты ў 1924 г. працягвалі вучобу на педагагічным факультэце Белдзяржуніверсітэта.

У канцы 20-х гадоў краіна ўступіла на шлях індустрыялізацыі. Значна ўзраслі патрэбнасці ў кваліфікаваных кадрах. У лістападзе 1929 г. Пленум ЦК УКП(б) прыняў пастанову аб пашырэнні сеткі ВНУ. У жніўні 1930 г. Магілёўскі педагагічны інстытут быў адноўлены. У ім працавалі два аддзяленні – гісторыка-эканамічнае і літаратурна-лінгвістычнае з двухгадовым тэрмінам навучання. У лістападзе 1930 г. вучобу пачалі 103 студэнты першых курсаў. Выкладчыцкі калектыў складаўся з 10 чалавек. У гэтым жа годзе быў адкрыты педагагічны рабфак, а праз год – вячэрняе аддзяленне і сектар завочнага навучання. У 1933 г. ствараюцца два новыя аддзяленні – эканамічнае дзённае і прыродазнаўчае на завочным сектары. Тэрмін навучання быў павялічаны да трох год.

Інстытут ужо ў той час рыхтаваў перш за ўсё нацыянальныя кадры. У 1931 г. 85,3% студэнтаў складалі беларусы. У 1932 г. першыя 76 выпускнікоў былі накіраваны на працу ў школы рабочай і сялянскай моладзі. У 1934 г. аддзяленні інстытута рэарганізуюцца ў факультэты з 4-гадовым тэрмінам навучання: гістарычны, геаграфічны, мовы і літаратуры (рускае і беларускае аддзяленні). Узрасла колькасць навучэнцаў – у 1935 г. на дзённым аддзяленні навучалася каля 800 студэнтаў. У 1936 г. студэнты ўпершыню здавалі дзяржаўныя экзамены.

У 1937г. пры педінстытуце ствараецца настаўніцкі інстытут, які рыхтаваў настаўнікаў 5-7-х класаў. Сектары завочнага навучання ў 1939 г. пераўтвара-

Могилевский государственный университет имени А. А. Кулешова

юцца ў аддзяленне завочнага навучання з 4-гадовым тэрмінам вучобы. Значна пашырылася матэрыяльная база. Інстытут меў добра абсталяваныя кабінеты і лабараторыі, спартыўную залу, стралковы цір, студэнцкі клуб. Быў пабудаваны 4-павярховы студэнцкі інтэрнат. Істотныя змены адбыліся ў выкладчыцкім калектыве. У 1941 г. у ВНУ працавала 69 выкладчыкаў, 14 з якіх былі выпускнікамі інстытута. У 1938 г. пры інстытуце адкрылася аспірантура па спецыяльнасцях: руская мова, руская літаратура, славяназнаўства. Першымі аспірантамі сталі выпускнікі МПІ.

Плённа працаваў літаратурны гурток інстытута. З яго выйшлі вядомыя літаратары В.Матэвушаў, І.Валасевіч, П.Шасцерыкаў. Разнастайная культурна-масавая работа праводзілася ў інстытуцкім клубе. Дзейнічалі хор, струнны і духавы аркестры, танцавальны і драматычны гурткі. У 23 спартыўных секцыях у 1939 г. займалася 400 студэнтаў.

У пачатку 40-х г.г. Магілёўскі пединстытут стаў адным з буйнейшых ВНУ Беларусі. На дзённым і завочным аддзяленнях навучалася больш як 2 тыс. студэнтаў. Толькі на дзённым аддзяленні было падрыхтавана звыш 1200 спецыялістаў.

Пачатак вайны інстытут спаткаў у самы разгар вучэбнай дзейнасці. Адразу пасля абвяшчэння вайны была створана група добраахвотнай самаабароны. Больш за 300 студэнтаў і выкладчыкаў запісалася добраахвотнікамі ў дзеючую Чырвоную Армію. Выхаванцы і супрацоўнікі інстытута актыўна ўдзельнічалі ў гераічнай абароне горада. Яны працавалі на стварэнні абаронных рубяжоў, забяспечвалі дзейнасць сеткі гандлёвых устаноў (кафэ, рэстаран, магазіны), дапамагалі параненым у шпіталях. Звыш 70 з іх увайшлі ў склад знішчальнага батальёна, узвод якога прыняў бой з нямецкім дэсантам 14.07.1941 г. каля в.Благавічы. 24 ліпеня 1941 года немцы ўварваліся ў памяшканне інстытута. Дырэктар МПІ Ю.А Шакаль, выкладчык Н.Д.Туміловіч, камсорг Ганжын былі адпраўлены ў канцэнтрацыйны лагер.

Падчас акупацыі ў глыбокім падполлі, у партызанскіх атрадах, у радах Чырвонай Арміі мужна біліся з ворагам многія былыя выхаванцы і работнікі МПІ. У горадзе Магілёве актыўнымі ўдзельнікамі падпольных груп была О.Н.Карпінская, Т.П.Агароднікава. Баявую групу арганізаваў І.М.Лысіковіч. У горадзе Клімавічы былым дырэктарам пединстытута І.Н.Пяроўскім і студэнткай Лідай Асмалоўскай было арганізавана выкраданне знакамітага разведчыка барона фон Файта.

На зямлі далёкай Францыі змагаўся выпускнік МПІ Ф.Ф.Кажамякін, які быў пасмяротна ўзнагароджаны Ордэнам Ганаровага Легіёна. Трое выхаванцаў інстытута сталі Героямі Савецкага Саюза: Д.П.Жмуроўскі, камандзір кулямётнага разліка, вызначыўся ў Корсунь-Шаўчэнкаўскай, Ясса-Кішанёўскай аперацыях і пры фарсіраванні р.Буг; П.С.Данілюк, камандзір артпалку – удзельнічаў у Берлінскай аперацыі, М.Р.Рабчэўскі – меў 192 баявых вылеты, які знішчыў 25 самалётаў ворага.

У гады вайны значныя страты панесла матэрыяльна-тэхнічная база інстытута. Цалкам загінула бібліятэка, было знішчана абсталяванне ўсіх кабінетаў. У навучальным корпусе быў разбураны дах 3-га паверха. Корпус патрабаваў поўнага аднаўлення. Не засталося ніводнага прыгоднага для працы памяшкання. Амаль у такім жа стане было памяшканне студэнцкага інтэрната.

Магілёўскі дзяржаўны педагагічны і настаўніцкі інстытуты аднавілі сваю работу ў 1944 годзе згодна з Пастановай СНК БССР ад 24 ліпеня 1944 года ў складзе наступных факультэтаў: мовы і літаратуры, гістарычнага і геаграфічнага (пединстытут); аддзяленняў: гісторыка-філалагічнага і прыродазнаўча-геаграфічнага (настаўніцкі інстытут). У 1944-45 навучальным годзе гісторыка-філалагічнае аддзяленне настаўніцкага інстытута было падзелена на два аддзяленні: гістарычнае, мовы і літаратуры.

Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. Куляшова

У ліпені-жніўні 1944 года вяліся пошукі памяшканняў для вучэбных заняткаў і адміністрацыі, пачалося ўкамплектаванне штата выкладчыкаў, была зроблена аб'ява аб наборы студэнтаў, набываліся вучэбныя і наглядныя дапаможнікі, аднаўлялася бібліятэка, кабінеты, вяліся пошукі мэблі. Студэнты інстытута неаднаразова ўдзельнічалі ў суботніках па аднаўленні сваёй навучальнай установы. У канцы 1944 года была адноўлена частка даваеннага інтэрната, на першым паверсе якога стала працаваць адміністрацыя і адкрыліся першыя вучэбныя кабінеты. Другі паверх быў прыстасаваны пад жыллё студэнтаў і выкладчыкаў. Пачала працаваць студэнцкая сталоўка. Для таго, каб палепшыць харчаванне студэнтаў і выкладчыкаў, было вырашана ўтварыць падсобную гаспадарку. Студэнты самі займаліся нарыхтоўкай паліва для патрэб інстытута. Складаным было пытанне, звязанае з забеспячэннем жыллём студэнтаў і выкладчыкаў. Першы набор на ўсе курсы суправаджаўся прапановай з боку адміністрацыі, каб студэнты з'яўляліся да 1 верасня са сваімі хатнімі і пасцельнымі рэчамі.

На працягу жніўня-верасня 1944 года быў праведзены набор на падрыхтоўчае аддзяленне інстытута. Адбывалася залічэнне і аднаўленне студэнтаў на старэйшыя курсы. Аднавіў сваю працу і завочны сектар. Усяго ў 1944-45 навучальным годзе ў інстытуце налічвалася 570 студэнтаў на дзённым аддзяленні і 357 – на завочным. У штаце інстытута на 1 верасня налічвалася 16 выкладчыкаў, з ліку якіх толькі 4 мелі вучоную ступень.

Восенню 1945 года інстытуту для правядзення вучэбных заняткаў быў перададзены адноўлены будынак школы № 24, значная колькасць мэблі, інвентару і вучэбнага абсталявання. Заняткі ў 1945-46 навучальным годзе праходзілі ўжо ў аўдыторыях з зашклёнымі вокнамі, з электрычным асвятленнем. Вучэбны працэс забяспечвалі больш за 50 выкладчыкаў, аб'яднаных на 10 кафедрах. Паступова павялічваўся фонд бібліятэкі, які ў 1946 годзе складаў 6 тыс. тамоў розных кніг.

Большасць студэнтаў паспяхова асвойвала вучэбныя праграмы і паказвала добрыя веды на экзаменах і заліках. Значная частка студэнтаў атрымлівала дзяржаўную стыпендыю. У той жа час большасць студэнтаў павінны былі плаціць грошы за вучобу. За выдатныя паказчыкі, выдатныя веды некалькі студэнтаў атрымлівалі стыпендыю імя Сталіна.

Паступова павялічвалася колькасць выкладчыкаў, сярод якіх узрасла доля тых, хто меў вучоную ступень і званне. У красавіку 1947 года ў інстытуце працавалі 69 выкладчыкаў, у тым ліку прафесар Г.Г.Шэнберг, 4 кандыдаты навук, якія мелі званне дацэнта, і адзін магістр.

У 1947-48 навучальным годзе было адкрыта фізіка-матэматычнае аддзяленне, якое ў наступным годзе было пераўтворана ў факультэт. У 1952 годзе згортваецца работа настаўніцкага інстытута, апошні выпуск якога адбыўся летам 1953 года.

Паляпшэнне складу выкладчыкаў дазволіла ўзняць узровень выкладання і пашырыць дыяпазон навуковых даследаванняў. Вынікі навуковых, навукова-метадычных работ выкладчыкаў інстытута сталі друкавацца ва ўтвораных "Учёных записках института".

Да сярэдзіны 50-х гадоў удалося аднавіць даваенны вучэбны корпус інстытута. Значна палепшылася матэрыяльная база інстытута, пашыралася бібліятэка, лепшымі сталі ўмовы жыцця і адпачынку студэнтаў і выкладчыкаў. Сур'ёзна змяніўся кантынгент студэнтаў. Абсалютную большасць з іх (сярод студэнтаў дзённага аддзялення) складалі выпускнікі сярэдніх школ. Усяго на чатырох факультэтах у 1955 годзе навучалася больш за 3 тыс. чалавек, у тым ліку на дзённым аддзяленні навучалася 1450. На 13 кафедрах працавалі 119 выкладчыкаў, у тым ліку 39 дацэнтаў і кандыдатаў навук. Паступова павялічвалася колькасць выкладчыкаў з ліку лепшых выпускнікоў інстытута. Пашыралася кола навуковых пытанняў, якімі займаліся выкладчыкі інстытута.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Калектыў інстытута пераадольваў сур'ёзныя цяжкасці, імкнуўся выканаць усе заданні ўрада па падрыхтоўцы высокакваліфікаваных педагагічных кадраў. За першае пасляваеннае дзесяцігоддзе было падрыхтавана больш за 3,5 тыс. настаўнікаў розных спецыяльнасцей.

У другой палове 50-х гадоў істотна змяніліся правілы прыёму ў вышэйшыя навучальныя ўстановы СССР. Першыя гады прыёму ў МДПІ па новых правілах змянілі склад студэнтаў. Так, са 150 студэнтаў, прынятых на дзённае аддзяленне ў 1957 годзе, 148 мелі працоўны стаж, 40 чалавек прыйшлі на вучобу пасля службы ў Савецкай Арміі. У 1956 годзе адбыўся пераход на шырокі профіль спецыяльнай адукацыі. Былі сфарміраваны гісторыка-геаграфічны і філалагічны факультэты з шасцігадовым тэрмінам навучання. У 1958 годзе быў утвораны новы факультэт – педагогікі і методыкі пачатковага навучання. У 1959 годзе прыпынены прыём на вячэрняе аддзяленне.

У 1963 годзе была праведзена новая рэарганізацыя інстытута: былі аднаўлены гістарычны і геаграфічны факультэты з чатырохгадовым тэрмінам навучання. На філалагічным факультэце адбылося раз'яднанне на два аддзяленні: рускай і беларускай мовы і літаратуры. На працягу наступных 14-ці год МДПІ меў 5 факультэтаў: фізіка-матэматычны, гістарычны, філалагічны, геаграфічны, педагогікі і методыкі пачатковага навучання.

Значна змянілася і матэрыяльная база інстытута. У 1959 годзе было завершана будаўніцтва новага студэнцкага інтэрната на 426 месцаў са здраўпунктам і сталовай побач з вучэбным корпусам. Была пабудавана і новая спартыўная зала. У прыгарадзе Магілёва, у прыгожым месцы на беразе Дняпра былі створаны геаграфічная станцыя і вучэбна-вопытны ўчастак для правядзення сельскагаспадарчай практыкі студэнтаў. У 1970 годзе інстытут атрымаў новы вучэбны корпус па вул. Касманаўтаў – пяціпавярховы будынак з сучаснымі вучэбнымі аўдыторыямі і лабараторыямі. Рэзка вырас кніжны фонд інстытуцкай бібліятэкі, які складаў больш за 250 тысяч тамоў.

У 70-90-я гады ВНУ працягвала развівацца. З 1971 года на новых навучальных планах педагагічныя дысцыпліны сталі вывучацца ва ўсім перыядзе навучання. Стала больш спецкурсаў, спецсемінараў і факультатываў. Узмацненню педагагічнай накіраванасці МДПІ садзейнічала перадача ў 1973 годзе інстытута з Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі ў ведзенне Міністэрства асветы. У тым жа годзе пачало працаваць падрыхтоўчае аддзяленне, якое штогод рыхтавала для паступлення ў ВНУ каля 50 чалавек.

Педінстытут улічваў патрэбнасці навучальных устаноў у тых альбо іншых педагагічных кадрах. Так, у 1977 годзе адбыўся апошні выпуск на геаграфічным факультэце. Але ў тыя ж 70-я гады павялічыўся прыём на фізмат. У 1978 годзе быў заснаваны факультэт дашкольнага выхавання, які за сваю 20-гадовую гісторыю падрыхтаваў на дзённым і завочным аддзяленнях звыш 3000 спецыялістаў. Праз тры гады адчыніў свае дзверы ваенна-спартыўны факультэт, які зараз завецца Факультэтам фізічнага выхавання. У 1990 годзе быў створаны біялагічны факультэт, які ў 1997 годзе атрымаў назву факультэта прыродазнаўства. З 2 ліпеня 1997 года падрыхтоўчае аддзяленне было трансфармавана ў факультэт даінстытуцкай падрыхтоўкі і прафарыентацыі.

Новыя плыні ў асэнсаванні сучасных тэхналогій адукацыі патрабавалі і новых падыходаў да яе арганізацыі. У 1990 годзе ствараецца і паспяхова працуе вучэбны комплекс, які ўключае ў сябе ВНУ, як базавую структуру, упраўленне адукацыі аблвыканкама, як заказчыка, абласны інстытут удасканалення настаўнікаў, педагагічны каледж, абласны каледж, абласны ліцэй пры ВНУ, некалькі гімназій і сярэдніх школ. Такім чынам, з'явілася магчымасць распрацаваць і ўкараніць бесперапынныя адукацыйныя тэхналогіі на трох этапах: да ВНУ, у ВНУ і пасля ВНУ.

Значныя змены ў статусе ВНУ адбыліся ў 1997 г. З лета гэтага года Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А.А.Куляшова ажыццяўляе сваю

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

дзейнасць як Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А.А.Куляшова. Мэтай гэтага пераўтварэння з'яўляецца ўдасканаленне падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі навукова-педагагічных кадраў, а таксама правядзенне фундаментальных навуковых работ дзеля патрэбнасцей усходняга рэгіёна Рэспублікі Беларусь. У сувязі з гэтым плануецца пераход на падрыхтоўку не толькі педагагічных кадраў, але і спецыялістаў для іншых галін народнай гаспадаркі.

На сённяшні час МДУ налічвае 8 факультэтаў, 32 кафедры, на якіх працуюць амаль што 400 выкладчыкаў, 164 з якіх маюць вучоныя ступені і званні, у тым ліку 20 дактароў навук і прафесараў.

Для якаснай падрыхтоўкі спецыялістаў МДУ імя А.А.Куляшова валодае ўсім неабходным. У ВНУ падабраўся добры склад выкладчыкаў, сярод якіх 40% маюць вучоныя ступені і званні. Толькі за перыяд з 1992 па 1996 гады выкладчыкамі было абаронена 30 дысертацый, у тым ліку доктарскія дысертацыі абаранілі Валасевіч А.У., Кушнер Ю.З., Радзькоў А.М., Рыер Я.Р. Выкладчыкі універсітэта пастаянна павышаюць сваю кваліфікацыю. Так, у 1994-1996 гадах звыш 20% выкладчыкаў былі ў ІПК, ІФК, на стажыроўцы ў вядучых ВНУ, НДІ. У снежні 1991 года МДУ адчыніў сваю аспірантуру, у якой зараз навучаецца па 6 спецыяльнасцях прыродазнаўчага, гуманітарнага і педагагічнага профілю 22 чалавекі.

У МДУ выкладчыкамі праводзяцца разнастайныя навуковыя даследаванні. Толькі ў рамках фундаментальных навуковых даследаванняў у апошнія 3 гады распрацоўвалася 19 асноўных тэм, у тым ліку 5 у рамках рэспубліканскіх праграм. У МДУ склалася некалькі навукова-педагагічных школ:

1. "Перадматэматычная і матэматычная падрыхтоўка дашкольнікаў і малодшых школьнікаў", якую заснаваў А.А.Столяр. Пад кіраўніцтвам прафесара Столяра было абаронена 20 кандыдацкіх дысертацый. Навукоўцы распрацоўваюць прагрэсіўную тэхналогію матэматычнай адукацыі, рыхтуюць падручнікі і дапаможнікі. Прафесар Н.М.Раганоўскі, Л.А.Латоцін, Б.Д.Чэбатарэўскі па заданню Міністэрства адукацыі распрацоўваюць канцэпцыю і праграму матэматычнай падрыхтоўкі ў 12-гадовай школе.

2. Навукова-лінгвістычная школа "Функцыянаванне і вывучэнне беларускай і рускай моў у варунках двухмоўя" была заснавана Г.Н. Клюсавым, П.Ю.Юргелевічам, А.Л.Юрэвічам. Зараз у рамках яе працуюць прафесары М.В.Абабурка, М.А.Аўласевіч, В.І.Рагаўцоў, дацэнты Іваноў Е.Е., С.Я.Кечык, Л.І.Шапавалава і іншыя. Яны выдалі 7 манаграфій, 9 падручнікаў і дапаможнікаў.

3. Навукова-педагагічная школа "Старажытная гісторыя Беларусі і стран Еўропы (па археалагічных дадзеных)", якую заснаваў Г.І.Іонэ. Яе развіваюць Я.Р.Рыер і В.Ф.Капыцін. Школа існуе больш за 25 год. Складзена падрабязнае апісанне археалагічных помнікаў Магілёўшчыны, сабрана каля 300 тыс. старажытных рэчаў, якія захоўваюцца ў музеях, у тым ліку ў археалагічным музеі універсітэта, які стаў навуковай лабараторыяй.

4. З пачатку 80-х гадоў навукова-педагагічная школа пад кіраўніцтвам А.М.Радзькова займаецца практычнай рэалізацыяй ідэй і тэхналогій у вучэбным комплексе: універсітэт – аддзел адукацыі – педагагічны каледж – ліцэй – гімназія – школа.

5. У працэсе станаўлення знаходзіцца школа доктара фізіка-матэматычных навук А.У.Валасевіч, галоўны напрамак якой фізіка іёнасферы і магнітасферы Зямлі. Работа праводзіцца па заказу інстытута касмічных даследаванняў РАН. А.У.Валасевіч прымае ўдзел у рабоце па расійска-французскаму праекту.

У навукова-даследчай рабоце прымаюць удзел і студэнты. Штогод на студэнцкіх навуковых канферэнцыях заслухоўваецца каля 400 дакладаў, 18 студэнтаў працуюць над дзяржбюджэтнымі тэмамі. Лепшыя студэнты праходзяць падрыхтоўку па праграме бакалаўраў.

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Могилевский государственный университет имени А.А. Кулешова

Творчай працы студэнтаў, іх вучобе дапамагае ўласная бібліятэка, кніжны фонд якой на 1 студзеня 1997 года складаў 461156 адзінак. У бібліятэцы запісана 6291 чытачоў, большасць з каторых – студэнты. Гэта і не дзіўна, бо ў 1997-98 навучальным годзе ў МДУ навучалася 5500 студэнтаў, 3200 з якіх на стацыянары. У распараджэнні студэнтаў інтэрнаты, 2 сталовыя на 480 месцаў, санаторый-прафілакторый на 50 месцаў, медпункт, кафэ “Лабірынт”.

Тысячы выпускнікоў нашай ВНУ працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі Беларусі і іншых краін свету. Сярод іх ёсць і вядомыя людзі. У 1975 годзе гістарычны факультэт скончыў першы прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнка. У МДУ ёсць усе падставы з аптымізмам глядзець у будучыню.